УДК 656.13

Рожко А. Г.

# МОВА ЯК ЧАСТКА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Навуковы кіраўнік: Міцкевіч К. М., ст. выкладчык*
*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**

У артыкуле коратка выкладзена становішча беларускай мовы ў нацыянальнай культуры на працягу гістарычнага шляху беларускага народа.

**Ключавыя словы:** мова, беларуская мова, культура

Rozhko A. G.

# LANGUAGE AS A PART OF NATIONAL CULTURE

*Sientific Supervisor: Mitskevich K. M., Senior Lecturer*
*Belarusian National Technical University*
*Minsk, Republic of Belarus*

**Abstract**

The article briefly outlines the position of the Belarusian language in the national culture throughout the historical path of the Belarusian people.

**Keywords:** language, Belarusian language, culture

"Хто не паважае родную мову, не паважае родны народ"– так на конт беларускай мовы выказвауся Іван Мележ.

Мова – найважнейшы сродак зносін паміж людзьмі. Дзеля таго каб існаваць, людзі павінны дамовіцца паміж сабою пра супольныя справы, размеркаванне абавязкаў, пра  вызначэнне агульных планаў і г.д. Ажыццяўленне падобнага тыпу патрэб і дасягаецца пры дапамозе мовы. Мова ўзнікае з настойлівай патрэбы грамадства і ў грамадстве, гэта – сацыяльная з’ява. Але мова – гэта не толькі сродак, з дапамогай якога людзі наладжваюць сувязі, абменьваюцца

іфармацыяй, яна – своеасаблівае люстэрка жыцця і працы народа, яго грамадскага і культурнага развцця.

Мова з'яуляецца адной з найважнейшых прыкмет нацыі, падмуркам этнічнага самаўсведамлення народа, асновай культуры. Яна адлюстроўвае жыццёвы вопыт народа, асаблвасці яго мыслення і псіхікі, маральна-этычныя і эстэычныя нормы.

Мова – частка чалавечай культуры, гістарычнай спадчыны. Дзякуючы ёй, працягваюць жыць традыцыі. Мова абуджае цікавасць да пазнання свету, садзейнічае праяўленню павагі да нашага мінулага і служыць элементам аб'яднання людзей незалежна ад месца і часу іх пражывання.

Кожная літаратурная мова мае сваю адметную гісторыю, праходзіць свой адметны шлях, неаддзельны ад гісторыі народа. Колькі ў свеце літаратурных моў, столькі і шляхоў іх станаўлення, развіцця. Сваю гісторыю мае і беларуская мова.

Свой пачатак як дзяржаўная мова, беларуская мова бярэ с часоў ВКЛ. Старабеларуская мова з'яўлялась асноўнай літаратурна-пісьмовай у Вялікім княстве Літоўскім. У той час яе называлі "проста мова" (тэрмін "беларуская мова" узнік пазней).

Высокі ўзровень беларуская мова мела і ў XV – XVII стст. беларускае мастацкае пісьменства: летапісы (хронікі), мемуары, творы мастацкай літаратуры.

У другой палове XVI ст. паводле Люблінскай уніі Вялікае княства Літўскае і Каралеўства Польскае аб"ядналіся ў адну дзяржаву — Рэч Паспалітую. Кіруючая палітычная роля сканцэнтравалася (асабліва з другой паловы XVII ст.) у руках польскіх магнатаў. У 1696 г. аб"яўляецца закон, паводле якога на Беларусі дзяржаўнаю моваю становіцца польская. Беларуская літаратурна-пісьмовая мова перажывае заняпад, развіваецца толькі жывая, народнадыялектная мова.

У канцы XVIII ст., пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай, Беларусь увайшла ў Расійскую імперыю. Загадам Мікалая I ў 1840 г. на Беларусі ў якасці афіцыйнай уводзіцца руская мова. Беларуская мова ў гэты і пазнейшыя часы ў афіцыйны ўжытак, пісьменнасць, школы не дапускалася.

Такім чынам, сучасная літаратурная беларуская мова пачынае складвацца амаль праз два стагоддзі пасля спынення старабеларускай пісьмовай традыцыі.

На сеняшні момант беларуская мова з'яўляецца, з аднаго боку, прадметам вывучэння лінгвістаў, а з другога, - прадметам дыскусіі, адным з палюсоў якой з'яўляецца праблематызацыя самай легітымнасці беларускай як паўнапраўнай мовы.

Моўная культура беларускага народа надзвычай багатая і самабытная. Яна ўвасоблена ў поўных чароўнага хараства песнях, у афарбаваных міфічнасцю легендах, паданнях і дасціпныхных, мудрых прыказках, у адмысловых загадках і магічна-таямнічых замовах, у трапных выслоўях і дасканалых па форме і мастацкіх якасцях казках, у творах мастацкай, навуковай літаратуры і г. д. Гэтыя моўныя скарбы раскрываюць нам гісторыю народа, сведчаць пра яго сацыяльны інтэлект, далучаюць нас да маральных, эстэтычных каштоўнасцей, створаных народам за стагоддзі, дапамагаюць зразумець яго філасофію, мастацкія вобразы, авалодаць сакрэтамі яго мова-творчай дзейнасці. Захоўваючы духоўную спадчыну народа, замацоўваючы ў слове ўсе тое, што прынята называць культурай, мова яднае нашчадкаў і продкаў, звязвае мінулае з сучасным і будучым.

На працягу ўсяго свайго існавання беларуская мова адыграла выключную ролю ў гісторыі беларускага народа, у станаўленні яго дзяржаўнасці. Усім сваім развіццём на працягу XX ст. яна даказала сваю жыццёвасць і неабходнасць. Нягледзячы на складанасці моўнага жыцця, асаблівасці развіцця сістэмы мовы і ступені запатрабаванасці ў камунікатыўнай прасторы яна заўсёды была бадай што асноўным фактарам падтрымання нацыянальнай культуры і нацыянальнай свядомасці народа. У XXI ст. беларуская мова ўвайшла з цэлым комплексам праблем, якія датычацца развіцця яе сістэмы і месца ў камунікатыўнай прасторы. Гэта звязана ў першую чаргу з асаблівасцямі папярэдняга развіцця і спецыфікай сучаснай моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусі, якая вызначаецца як дзяржаўнае блізкароднаснае беларуска-рускае двухмоўе. Аднак заканадаўчы статус суіснуючых беларускай і рускай моў і іх рэальнае становішча ў камунікатыўнай прасторы істотна адрозніваецца, што абумоўлена шэрагам прычын як аб’ектыўнага, так і суб’ектыўнага характару.

Нягледзячы на неспрыяльныя сацыяльна-палітычныя ўмовы, у якіх часта аказвалася беларуская літаратурная мова, развіцце на ей розных жанраў мастацкай, публіцыстычнай, навуковай літаратуры

не спынялася на працягу XX ст. Дзякуючы шматграннай, featured рознабаковай творчасці пісменнікаў, вучоных, узбагаціўся слоўнікавы запас беларускай літаратурнай мовы, удасканаліліся яе выяўленчыя сродкі і прыемы літаратурнага выказвання, кадыфікаваны нормы. Беларуская літаратурная мова набыла неабходную культуру, "інтэлектуальнасць", стала здатнай для таго, каб ствараць на ей самыя разнастайныя па характары і змесце творы. На беларускай мове выдадзены шматтомныя галіновыя энцыклапедыі, слоўнікі (тлумачальныя, перакладныя, гістарычныя, этымалагічныя і інш.), граматыкі, манаграфіі, на ей існуе багатая і самабытная мастацкая і публістычная літаратура. Інакш кажучы, сення беларуская літаратурная мова – адна з багатых і развітых моў, прадстаўленая ўсімі функцыянальнымі стылямі і жанрамі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Азарка, В. У. Беларуская мова: спецыяльная лексіка: вучэбна-метад. дапам. / В. У. Азарка, А. С, Васілеўская, М. М. Круталевіч. – 3-е выд., перапрац. – Мінск: БДПУ, 2007. – 207 с.

2. Крамко, І. І. Гісторыя беларускай літаратурнай мовы: у 2 т. Т. 2 / І. І. Крамко, А. К. Юрэвіч, А. І. Яновіч; пад рэд. А. І. Жураўскага. – Мн.: Навука і тэхніка, 1968. – 340 с.

3. Беларуская мова і нацыянальная культура [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://revolution.allbest.ru/languages/00744279_0.html. – Дата доступу: 24.03.2023.